**Семенас, Н.** А было яму толькі 20… / Н. Семенас // Пастаўскі край. — 2009. — 18 лют. — С. 2.

## А БЫЛО ЯМУ ТОЛЬКІ 20…

Штогод, 15 лютага, на Востраў Мужнасці і Смутку, які знаходзіцца ў горадзе Мінску, прыходзяць людзі, каб аддаць даніну памяці загінуўшым у Афганістане воінам.

І кладуцца да падножжа помнікаў і абеліскаў чырвоныя гваздзікі, як кроплі крыві, якую пралілі нашы землякі ў той жорсткай, незразумелай вайне.

Не вярнуўся дадому з той страшнай вайны і Урбель Аляксандр Казіміравіч... Ён нарадзіўся 24 чэрвеня 1965 года ў вёсцы Турлы Пастаўскага раёна ў звычайнай сялянскай сям'і. Вучыўся ў Целякоўскай базавай школе. (У той час яна размяшчалася ў вёсцы Турлы). Хата хлопчыка знаходзілася амаль побач са школай. На кожным перапынку праз школьны агарод ён бегаў дадому. У памяці настаўнікаў, якія вучылі хлопчыка, захаваліся самыя светлыя і добрыя ўспаміны пра Сашу.

Вось што ўспамінае пра яго настаўніца рускай мовы і літаратуры Цяляк Дзіна Пятроўна: «Саша быў вельмі сімпатычны. Круглы твар, карыя вочы, цёмныя валасы, на шчоках – ямкі. Захапляўся спортам. Па ўсіх прадметах займаўся добра.

Меў выдатны голас, таму прымаў актыўны ўдзел у мастацкай самадзейнасці.

Саша быў добра выхаваны. Яго паважалі настаўнікі і вучыні.

З пяшчотай і любоўю прыгадвае пра Аляксандра Цяляк Ірына Мікалаеўна, таксама настаўніца рускай мовы і літаратуры: «Яго разумныя вочы прыцягвалі да сябе. Вясёлая ўсмешка, добры позірк, лагоднасць да ўсіх.

На ўроках заўсёды ўважліва слухаў тлумачэнні настаўніка, імкнуўся ўсё запомніць, асэнсаваць. А як ён спяваў! Быў вельмі сціплы. Сціпласць ва ўсім заўсёды мяне ўражвала».

Пасля заканчэння школы Саша вучыўся ў Пастаўскім СПТВ-165. Атрымліваў прафесію механізатара. Дамоў пасля вучобы ездзіў кожны дзень. У інтэрнаце не заставаўся нават зімой.

Была ў яго мара – набыць матацыкл. Яна хутка ажыццявілася.

Пасля заканчэння вучобы працаваў у калгасе імя Мічурына. З любоўю адносіўся да тэхнікі. У тую восень з калгаса многія хлопцы пайшлі ў армію. Трапіў хто куды, Саша – у Афганістан.

– Як прыслаў Саша першы ліст з Афганістана, так і пацямнела для нас сонейка, а потым і зусім закацілася, – у матулі Таццяны Рыгораўны слёзы на вачах.

Шчырыя, поўныя любові і павагі, пісаў лісты Саша сваім родным і блізкім з невялікага гарадка Баграма, які знаходзіўся за 70 кіламетраў ад Кабула. У іх апавядаў пра сваю службу, (а ён быў сувязістам), адпачынак. І ні слова пра небяспеку, якая падпільноўвала там на кожным кроку. Ні слова пра смерць, якая лютавала на афганскай зямлі кожны дзень.

Наадварот, Саша знаходзіў у сабе сілы любавацца прыродай той суровай краіны. Вось вытрымкі з яго лістоў: «Зараз вясна. Усё ў зялёным убранні. Летам гэта прыгажосць згасне. Трава выгарыць ад спякотнага сонейка. Лісце на дрэвах пакрыецца пылам.

Навокал горы. Да іх 50–60 кіламетраў, а здаецца, што яны зусім побач».

І ніводнага слова пра небяспеку. Усё спакойна... І шматкроп'е. Сёння мы разумеем, што хавалася за гэтым. І яшчэ больш балюча сціскаецца сэрца. «Толькі крыху сумна мне. Але нічога, дамоў прыеду – нагуляюся...» Марыў, спадзяваўся, але марам не наканавана было збыцца...

А як кранае сэрца апошняе віншаванне з Новым, 1985 годам, якое Саша даслаў настаўніцы Цяляк Ірыне Мікалаеўне. Ён увесь час пісаў ёй лісты. «Хачу ад усёй душы пажадаць Вам усяго самага найлепшага: шчасця, здароўя, поспехаў у працы, а самае галоўнае – чыстага і мірнага неба над галавой».

Сёння ў нас над галавой чыстае і мірнае неба, але Сашы з намі няма. Хіба думаў ён у тую хвіліну, што зусім мала яму засталося жыць. Страшная афганская вайна забрала хлопца з простай беларускай вёсачкі Турлы, а было яму толькі 20. Без яго ўзыходзіць сонейка і цвітуць увесну сады, без яго цячэ рачулка праз вёску, на якой ён, заядлы рыбак, мог гадзінамі сядзець з вудай, без яго гуляюць вяселлі і будуюць жыллё. Саша застаўся навекі юным. Памяць пра яго назаўсёды захаваецца ў нашых сэрцах,

**Н. Семенас,**

**Настаўніца Целякоўскай школы**